ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама
А.В.Клімовіч
“ 1” лютага 2021 г.

**ІНСТРУКЦЫЯ**
**аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога конкурсу бібліятэчных праектаў для моладзі “Чытаем, вучымся, дасягаем поспеху”**

1. Дадзеная інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога конкурсу бібліятэчных праектаў для моладзі “Чытаем, вучымся, дасягаем поспеху” (далей – Конкурс).

2. Арганізатарамі Конкурсу з’яўляюцца ўпраўленне культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта і ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Ф. Карскага”.

3. Для правядзення Конкурсу складаецца аргкамітэт (Дадатак 1).

4. Конкурс праводзіцца з мэтай выяўлення лепшых бібліятэчных праектаў па абслугоўванні моладзі з высокім інавацыйным патэнцыялам; папулярызацыі кнігі і чытання ў моладзевым асяроддзі; пашырэння іх кругаагляду і павышэння культуры чытання.

5. Задачамі Конкурсу з’яўляюцца:

- стымуляванне творчай ініцыятывы бібліятэкараў, пошук цікавых і змястоўных формаў абслугоўвання маладых карыстальнікаў;
- садзейнічанне фарміраванню і рэалізацыі эфектыўных праектаў у галіне інфармацыйна-бібліятэчнага абслугоўвання моладзі;
- павышэнне якасці і пашырэнне пераліку бібліятэчных паслуг;
- далучэнне моладзі да сістэматычнага чытання і карыстання бібліятэкай;
- раскрыццё інфармацыйных рэсурсаў бібліятэчнай установы.

6. У Конкурсе прымаюць удзел раённыя (гарадская) бібліятэчныя сістэмы Гродзенскай вобласці (далей – Удзельнікі).

Удзельнікі павінны распрацаваць і ўкараніць праект, накіраваны на ўдасканаленне бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання моладзі.

Праекты могуць быць распрацаваны з прыцягненнем сацыяльных партнёраў і валанцёраў.

7. Конкурс праводзіцца па намінацыі “Лепшы бібліятэчны праект для моладзі”.

8. Для ўдзелу ў Конкурсе неабходна накіраваць заяўку па форме (Дадатак 2) і прадаставіць конкурсны праект у выглядзе тэкста і прэзентацыі да яго.

9. Матэрыялы, прадстаўленый на Конкурс, павінны ўключаць:

- апісанне праекта;
- прэзезентацыю, якая расказвае пра праект і ўтрымлівае тэкставы, фота-, відэа-, аўдыёматэрыялы і г.д., агульным аб'ёмам – не больш за 30 слайдаў;
- дадаткі (водгукі ўдзельнікаў, сцэнарыі, публікацыі ў СМІ, спасылкі на сацыяльныя сеткі).

10. Конкурсныя праекты ацэньваюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі да афармлення, а таксама па асноўным крытэрыям:

- інавацыйная актуальнасць прадстаўленай мадэлі праекта для моладзі (узровень навізны і ступень важнасці інавайцыі для бібліятэчных установ у цэлым);
- сацыяльная значнасць (паляпшэнне бібліятэчнага абслугоўвання ў раёне, вобласці ад рэалізацыі дадзенага праекта);
- перспектыўнасць (магчымасць укаранення праекта ў практыку работы іншых бібліятэк вобласці);
- адпаведнасць мэтам і задачам праекта, сістэмная работа ў яго межах;
- арыгінальнасць аўтарскіх канцэпцый, якія садзейнічаюць стварэнню станоўчага іміджу бібліятэкі сярод моладзі.

11. Матэрыялы, прадстаўленыя на Конкурс, павінны быць афармлены ў адпаведнасці з наступнымі патрабаваннямі:

- тэкст набраны ў тэкставым рэдактары Microsoft Word, шрыфт – Times New Roman, памер – 14, інтэрвал – 1;
- аб'ём тэкста ў тэкставым файле не павінен перавышаць 10 старонак,
- структура праекта павінна ўключаць наступныя элементы:
  - назва;
  - мэты;
  - задачы;
  - месца рэалізацыі;
  - дата рэалізацыі;
  - звесткі аб кіраўніку;
  - аналіз рэалізацыі праекта.

Не дапускаецца выкарыстоўваць матэрыялы з сеткі Інтэрнэт.

12. Для падвядзення вынікаў Конкурсу складаецца журы (Дадатак 3).

13. Па выніках Конкурсу журы вызначае пераможцаў з прысуджэннем першага, другога, трэцяга месцаў.

Журы пакідае за сабой права не прысуджаць узнагароды: пры адсутнасці ўдзельнікаў; калі праекты не ў поўнай меры адпавядаюць патрабаванням да конкурсных работ.

14. Матэрыялы прымаюцца па адрасе: 230023 г. Гродна, вул. Карбышава, 17, ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”, аддзел бібліятэказнаўства (з паметкай “На конкурс”) да 15 снежня 2021 года.

15. Праекты, якія не адпавядаюць патрабаванням да конкурсных работ, ці якія паступілі пазней названай даты, разглядацца не будуць.

16. Вынікі Конкурсу падводзяцца да 30 снежня 2021 года на пасяджэнні журы і афармляюцца пратаколам.

17. Выпіска з пратакола размяшчаецца на сайце ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага” (grodnolib.by).

18. Пераможцы Конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі ў фотарамках і прызамі.

19. Фінансаванне расходаў на правядзенне Конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных на цэнтралізаваныя мерапрыемствы ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”.

20. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуецца: выраб дыпломаў, набыццё фотарамак (для афармлення дыпломаў), падарункавых пакетаў і прызоў пераможцам Конкурсу.

21. Фінансаванне Конкурсу можа ажыццяўляцца за кошт іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Дадатак 1**
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога конкурсу бібліятэчных праектаў для моладзі "Чытаем, вучымся, дасягаем поспеху"

**АРГКАМІТЭТ**
абласнога конкурсу бібліятэчных праектаў для моладзі "Чытаем, вучымся, дасягаем поспеху"

1. Жук-Куніцкая Ірына Юр'еўна, галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветніцкай работы, мастацтва і навучальных устаноў упраўлення культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта;

2. Ігнатовіч Марына Эдвардаўна, дырэктар ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага";

3. Давыдзік Надзея Сяргееўна, загадчык аддзела бібліятэказнаўства ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага";

4. Лемяноўская Ірына Казіміраўна, галоўны бібліятэкар аддзела бібліятэказнаўства ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага";

5. Сцяпанава Галіна Аляксандраўна, галоўны бібліятэкар аддзела бібліятэказнаўства ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага".

**Дадатак 2**
да Інструкцыі аб парадку і правядзення абласнога бібліятэчных праектаў для моладзі "Чытаем, вучымся, дасягаем поспеху"

Аргкамітэт абласнога конкурсу бібліятэчных праектаў для моладзі "Чытаем, вучымся, дасягаем поспеху"

________________________________________
____________________________________
прозвішча, імя, імя па бацьку поўнасцю кіраўніка праекта

________________________________________
____________________________________
месца працы

________________________________________
____________________________________
пасада

________________________________________
________________________________________
________________________________________
________________________________________
кантактная інфармацыя: паштовы адрас, тэлефон, адрас электроннай пошты

ЗАЯЎКА

Прашу прыняць да разгляду работу ____________________________________________________________
____________________________________________________________
на абласны конкурс бібліятэчных праектаў для моладзі "Чытаем, вучымся, дасягаем поспеху".

Дата Подпіс (ініцыялы і прозвішча)

**Дадатак 3**
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога конкурсу бібліятэчных праектаў для моладзі “Чытаем, вучымся, дасягаем поспеху”

**СКЛАД ЖУРЫ**
абласнога конкурсу бібліятэчных праектаў для моладзі “Чытаем, вучымся, дасягаем поспеху”

1. Клімовіч Алена Віктараўна – начальнік упраўлення культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта, *старшыня журы Конкурсу;*

2. Ігнатовіч Марына Эдвардаўна, дырэктар ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”, *намеснік старшыні журы Конкурсу;*

3. Давыдзік Надзея Сяргееўна, загадчык аддзела бібліятэказнаўства ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”, *сакратар журы Конкурс*;

4. Жук-Куніцкая Ірына Юр’еўна, галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветніцкай работы, мастацтва і навучальных установаў упраўлення культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта;

5. Лотыш Ларыса Сцяпанаўна, загадчык аддзела выданняў на замежных мовах ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”;

6. Сцяпанава Галіна Аляксандраўна, галоўны бібліятэкар аддзела бібліятэказнаўства ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”;

7. Урбановіч Валерыя Уладзіміраўна, бібліятэкар сектара маркетынгу і сувязей з грамадскасцю ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”.